Том 18 • 2018 ACTA ALBARUTHENICA ISSN 1898-8091

**Таццяна Казак**
Варшава

# З мінулага ў будучыню: значэнне дзейнасці Юзафа Ядкоўскага – даследчыка горада Гродна ў сучаснай беларускай і польскай навуцы

Юзаф Ядкоўскі з'яўляецца знакавай асобай у гісторыі горада Гродна. Вядомы краязнаўца, стваральнік гродзенскага музея (1920), які ў тыя часы стаў важнай часткай культурнага аблічча горада і істотна ўплываў на свядомасць мясцовых жыхароў. Нарадзіўся ён 20 снежня 1890 года ў г. Гродне. З юнацтва пачаў цікавіцца гісторыяй. Разам з сябрамі выязджаў у вандроўкі па ваколіцах Гродна[1]. Наведваў Ружаны, Адэльск, Верхаўляны, Новы Двор, Альшанку, Хадароўку, Кузніцу, Сухаволю, Радзівонавічы, Папялоўку і інш., пра што сведчаць нататкі з вандровак, пачынаючы з 1907 г.[2]. Добра знаёмы быў з Элізай Ажэшкай: прыходзіў да яе ў дом, браў кнігі з бібліятэкі. Яна дапамагла Ю. Ядкоўскаму ўладкавацца ў Варшаве, калі ў гімназіі пачаліся ў яго праблемы з-за польскіх патрыятычных настрояў. Ён пакінуў гімназію і атрымаў сярэднюю адукацыю ў Варшаве[3]. У 1905–1906 гг. Ю. Ядкоўскі звязаўся з сацыялістычным рухам, быў сябрам Польскай сацыялістычнай партыі. Пра яго ўспамінае ў сваім артыкуле аб гродзенскай арганізацыі выкладчык хіміі з гімназіі – Праніслаў Шушкевіч, які ў гады вайны быў захавальнікам фондаў музея[4].

Разам з Ю. Ядкоўскім у гродзенскай гімназіі вучыўся Уладзіслаў Талочка – беларускі рэлігійны дзеяч, гісторык[5]. Яны пасябравалі з тых часоў, але, якое стаўленне да беларускай справы было ў Ю. Ядкоўскага мы ведаем толькі з яго выказванняў на старонках выданняў і перапіскі, і трэба дадаць, што яно не з'яўлялася прыязным. Сувязі двух асобаў з супрацьлеглых лагераў уяўляюць вялікую цікавасць. Напэўна, праз У. Талочку Ю. Ядкоўскі мог ведаць пра беларускія справы, калі б імі цікавіўся, а з іншага боку, ведаючы, што Ю. Ядкоўскі – прдстаўнік уладных структур, ксёндз мог замоўчваць праўду. Але дакладна вядома, што У. Талочка не стаяў у баку ад даследаванняў Ю. Ядкоўскага, дапамагаў

[1] Е.Ф. Орловский, *Гродненская старина,* часть I, Гродна 1910, с. 8.
[2] Архіў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея*,* справа № 4, арк. 1–31.
[3] A. Śnieżko, *Wydobył z ziemi gród, o którym nikt nie wiedział,* Białystok 2000, s. 7.
[4] B. Szuszkiewicz, *Organizacja grodzieńska P.P.S. 1898–1910,* Warszawa 1937, s. 18.
[5] A. Śnieżko, *Wydobył z ziemi gród...*, s. 18.

калегу. Атрымалася выявіць толькі адзін ліст, адрасаваны ксяндзом да кусташа музея. У 1923 г. ксёндз інфармаваў пра ксяндза Я. Вайштаровіча (XVII ст.)[1]. Перапіска вялася на польскай мове.

Цікавым падаецца факт, што Ю. Ядкоўскі, паляк, атрымоўваў вышэйшую адукацыю ў Археалагічным інстытуце ў Маскве, тэма яго дысертацыі – *О литовской гривне в связи с вопросом о древнейших денежных единицах в Литве*. Праца захоўваецца ў фондзе Аддзела пісьмовых крыніц Дзяржаўнага гістарычнага музея ў Маскве (Фонд асабістага паходжання ф. 431, спр. 99)[2].

Пасля вяртання на Радзіму ў Гродна Ю. Ядкоўскі займаў пасаду дзяржаўнага кансерватара па Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях[3]. Пасля Першай сусветнай вайны і вяртання незалежнасці польскай дзяржаве Гродна апынулася ў яе складзе, даследчык заняў пасаду чыноўніка па ахове спадчыны. На гэтай пасадзе ён прымаў актыўны ўдзел у многіх справах аховы помнікаў у міжваенны час. Дзякуючы даследчыцы Дароце Пірамідовіч атрымалася папрацаваць з дакументамі, звязанымі з дзейнасцю Ю. Ядкоўскага на пасадзе кіраўніка аддзела камісіі аховы помнікаў мастацтва і культуры пры Гродзенскім старостве, якую ён займаў ад пачатку сваёй прафесійнай дзейнасці ў Гродне з 1920 года. Напрыклад, ён прымаў актыўны ўдзел ў перадачы каталікам былога жаночага кляштара бернардынак у Гродне, што, безумоўна, суправаджалася доўгай перапіскай з уладамі. У сувязі з гэтым Ю. Ядкоўскі пісаў гістарычныя даведкі пра кляштар, перакладаў і перапісваў дакументы на лацінскай і расейскай мовах для ўладаў[4].

Ю. Ядкоўскі актыўна збіраў матэрыялы пра помнікі археалогіі і гісторыі не толькі Гродна, але і Гродзенскага павета. У лютым 1930 года быў складзены спіс помнікаў Гродзенскага павета (спіс помнікаў Гродна быў створаны яшчэ ў 1922 г.), якія ахоўваюцца дзяржавай. Ён быў высланы да розных дзяржаўных устаноў, у тым ліку паліцэйскаму кіраўніцтву Гродна, раённаму архітэктару і іншым. У спіс увайшлі, у першую чаргу, касцёлы, археалагічныя помнікі, жылыя і гаспадарчыя будынкі, з праваслаўных храмаў – толькі Каложская царква (у той час не належала адміністрацыйна гораду), пры гэтым згадваецца як былы базыльянскі храм, яшчэ “cerkiewka” – як пазначана ў спісе царква на могілках у в. Котра і капліца (пры гэтым указанне: праваслаўная/уніяцкая ў Вялікай Бераставіцы). Спіс адлюстроўвае тагачасныя

[1] Архіў ГДГАМ, справа № 4, арк. 97.

[2] Е. Глазунова, *Диссертация Юзефа Иодковского из фондов Государственного исторического музея,* „Банкаўскі веснік” 2018, люты, с. 20–23.

[3] A. Śnieżko, *Przeoczony jubileusz Józefa Jodkowskiego,* “Archeologia. Rocznik Polskiego Towarzystwa Archeologicznego” 1948, t. II, s. 435.

[4] D. Piramidowicz, *Kościół p. w. Narodzenia Matki Boskiej, Św. Antoniego Padewskiego i Św. Kazimierza oraz klasztor bernardynek w Grodnie* [w]: *Materiały do dziejów sztuki sakralnej na ziemiach wschodnich dawnej Rzeczypospolitej*, cz. IV: *Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa trockiego*, t. 3, red. M. Kałamajska-Saeed, 2016, s. 133–160.

акцэнты ў зборы падобнай інфармацыі, больш помнікаў, звязаных з польскай гісторыяй, менш з гісторыяй расійскага перыяду. Сам Ю. Ядкоўскі, накіроўваючы дадзены спіс, піша ад імя дырэкцыі музея: "Wymienienie zaś wiadomości nie sprawdzonych Dyrekcja uważa za niewskazane, przeto mogą być dosyć znaczne luki, szczególnie w zakresie wiadomości o świątyniach prawosławnych i zabytkach przed i wczesnohistorycznych"[1].

Справай жыцця Ю. Ядкоўскага стала стварэнне музея ў Гродне, дзе ён, будучы кіраўніком, актыўна займаўся навукова-даследчыцкай дзейнасцю. Ён разумеў разнастайнасць культуры Гродзеншчыны, дзе з даўніх часоў жылі побач розныя народы, якія стваралі непаўторнасць рэгіёну. Таму дзейнасць гродзенскага музея, дзякуючы намаганням Ю. Ядкоўскага, была накіраваная на даследаванне розных культур Гродзеншчыны: каталіцкай, праваслаўнай, іудзейскай, уніяцкай. Ю. Ядкоўскі быў сапраўдным музейшчыкам і living разнабаковым чалавекам. Дзякуючы яму былі заснаваныя музейная бібліятэка, калекцыя археалогіі, нумізматыкі, этнаграфіі, мастацкіх твораў і дакументаў, што гаворыць аб шырыні яго інтарэсаў, а напісаныя і выдадзеныя ім артыкулы, брашуры і кнігі – аб глыбіні яго ведаў. Большасць з артыкулаў прысвечана розным аспектам гісторыі Гродна – археалогіі, архітэктуры, удзельнікам і падзеям паўстання 1863 года, дзейнасці музея і яго каштоўным экспанатам, нумізматыцы і іншым тэмам.

Пра музейную дзейнасць Ю. Ядкоўскага тагачасныя пісьменнікі і журналісты выказваліся з вялікай павагай. Так, напрыклад, аўтар вядомых і часта вострых рэпартажаў віленскай газеты „Słowo" Юзаф Мацкевіч пісаў у 1936 годзе: "Nie chcę nikomu robić reklamy, ale przyznam, że z każdym krokiem nabieram coraz większego szacunku dla ofiarnej pracy kustosza Jodkowskiego. Gdybym był fachowcem, możebym zabrał głos w krytyce, że to nie jest ścisłe, tamto z punktu widzenia naukowego wątpliwe, ówdzie dopatrzył omyłki. Ale skąd mogę wiedzieć. Ja przede wszystkim widziałem ogrom wykonanej pracy. W ciągu kilku lat: remont, restauracja wewnętrznej linii, odtworzenie szczegółów. Nawet rysunek drzwi, styl krzeseł, ornament każdego klucza, framugi okiennej, kafel kominków – to wszystko rezultat długich badań i ciężkiej pracy jednego człowieka! W ten sposób zdobywa się izba za izbą, sala za salą odradza się w duchu starego zamku"[2].

Таксама хацелася б згадаць эсэ Зоф'і Налкоўскай 1926 года, прысвечанае Гродну, дзе яна апісвае гарадскую архітэктуру, вядомыя мясціны і з сучасных ёй асобаў называе толькі Ю. Ядкоўскага (іншых асобаў, за выключэннем Тызенгаўза і Станіслава Аўгуста Панятоўскага, там няма): "W Muzeum grodzieńskim, pełnym małych skarbów, wyszukanych po strychach i sklepikach, wydartych zniszczeniu i poniewierce przez

---

[1] Цытаты з польскамоўных крыніц прыводзяцца на мове арыгіналу. Архіў ГДГАМ, справа № 2, арк. 1.

[2] J. Mackiewicz, *Cztery dni w Grodnie: Słoneczne plamy na zamkowym parkiecie,* „Słowo" 1936, nr 18, s. 3.

entuzjastę Grodna i znanego już poza jego murami badacza, pana Jodkowskiego, znajdują się przepyszne szczątki stanisławowskiej biblioteki i bogaty zbiór odlewów, gemm i kamei”[1].

У Гродне Ю. Ядкоўскі, безумоўна, для ўсіх зацікаўленых асацыюецца з музеем – сучасным Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем, і наступнае – з археалагічнымі адкрыццямі на Замкавай гары ў 1930-х гадах. Музей быў створаны ў 1920 г. і з’яўляецца галоўным асяродкам па вывучэнню розных аспектаў дзейнасці горада. У выданні пад назвай *Краязнаўчыя запіскі* музей, пачынаючы з 1990 года, адлюстроўвае шматлікія аспекты дзейнасці ўстановы, у тым ліку і ў міжваенны час, калі захавальнікам і дырэктарам быў Ю. Ядкоўскі. Вывучэнне дзейнасці кусташа пачалося толькі пасля 1990 г., у савецкі час яна не даследавалася з ідэалагічных прычынаў.

Вельмі цікавай крыніцай па даследаванні музейнай і навуковай дзейнасці Ю. Ядкоўскага з’яўляецца карэспандэнцыя, якая захоўваецца ў фондах гродзенскага музея. Яна сведчыць пра вялікую колькасць даследчыкаў, інстытутаў, якія звярталіся ў музей, ці да якіх звяртаўся музей. У пошуках дакументаў пра музейную дзейнасць Ю. Ядкоўскага мы звярнуліся да архіваў, музеяў і бібліятэк Варшавы – Нацыянальнага музея, Інстытута мастацтва Польскай акадэміі навук, Архіва новых актаў, а таксама Музея Зямлі ПАН; у апошнім знаходзіцца фонд геолага Мечаслава Ліманоўскага, які быў сябрам і калегай Ю. Ядкоўскага і падтрымліваў з ім сувязь пасля таго, як Ю. Ядкоўскі пакінуў Гродна і пачаў сваю прафесійную працу ў Варшаве. Гэта перапіска таксама з’яўляецца цікавай крыніцай пра прыватныя справы Ю. Ядкоўскага ў сувязі з ад’ездам з Гродна ў 1937 годзе.

Археалогія была часткай прафесійных і навуковых зацікаўленняў Ю. Ядкоўскага, ёй прысвечана шмат месца ў карэспандэнцыі. На першым месцы – лісты да Міністэрства рэлігіі і асветы. Сярод цікавых лістоў, напрыклад, лісты да палкоўніка Л. Райскага, шэфа дэпартамента авіяцыі пры Міністэрстве ваенных спраў у 1927 г., дзе Ю. Ядкоўскі просіць выканаць фотаздымкі мясцовасці, дзе запланаваны археалагічныя раскопкі – Замкавай гары ў Гродне і Шведскай гары ў Ваўкавыску, падчас навучальных палётаў[2].

Мала сустракаецца дакументаў пра супрацоўніцтва з іншымі музеямі. У 1936 г. музей накіраваў ліст да кансерватара помнікаў мастацтва ў Любліне ў сувязі з артыкулам у газеце “Słowo” за 6 лістапада 1936 г. пра пахаванні ў Давід-Гарадку на Палессі, што былі выяўлены падчас будовы новай царквы. Журналіст Я. Мацкевіч накіраваўся агледзець знойдзеныя сярэднявечныя пахаванні з дырэктарам Беларускага музея ў Вільні Антонам Луцкевічам, Ю. Ядкоўскі піша пра апошняга: “nigdy archeologją nie zajmował się, a opiekuję się Muzeum Białoruskim z tego

[1] Z. Nałkowska, *Widzenie bliskie i dalekie*, Warszawa 1957, s. 309.
[2] Архіў ГДГАМ, справа № 1, арк. 55.

tytułu, że brat jego ś. p. Jan Łuckiewicz był miłośnikiem przeszłości i zbieraczem pamiątek rzekomo białoruskich"[1].

У сувязі з раскопкамі на Замкавай гары музей стаўся аб'ектам зацікаўлення многіх даследчыкаў. Ю. Ядкоўскага запрашалі падзяліцца вынікамі раскопак у Варшаўскую палітэхніку, на старонках навуковых і краязнаўчых выданняў[2]. Ю. Ядкоўскі друкаваў артыкулы пра знаходкі ў Гродне на старонках такіх агульнапольскіх выданняў, як "Radio", "Słowo". На старонках "Słowa" – артыкул пра адкрыццё царквы XII ст. у Гродне з'явіўся вельмі хутка. Ю. Ядкоўскі даслаў артыкул 31 жніўня 1933 г., а надрукавалі яго 2 верасня, пры гэтым даследчык адзначыў навіну: "Przyczem nadmiewam, że w prasie będzie on pierwszym, ponieważ do PAT komunikat jeszcze nie został wysłany"[3]. Вынікі раскопак становяцца ў 1933 годзе галоўнай тэмай перапіскі з міністэрствам, акружным і генеральным кансерватарамі ў Варшаве.

Калекцыі, назапашаныя Ю. Ядкоўскім, таксам сталі прадметам даследаванняў. На старонках вышэй названых музейных "Краязнаўчых запісак" аналізаваліся наступныя калекцыі і экспанаты з часоў Ю. Ядкоўскага: кнігазборы[4], тканіны[5], народнае мастацтва[6], фотанегатывы на шкле[7] і інш. Аналіз даваеннай этнаграфічнай калекцыі музея прадстаўлены на старонках працы Вольгі Лабачэўскай[8]. Удалай працай па адлюстраванні фатаграфічнай калекцыі і адначасова навуковай дзейнасці Ю. Ядкоўскага з'яўляецца праца польскіх даследчыкаў Пятра Ямскага і Марэка Залеўскага – *Supraśl 1913. Dokumentacja fotograficzna Józefa Jodkowskiego cerkwi Zwiastowania Najświętszej Marii Pannie*. На яе старонках надрукаваныя фотаздымкі царквы і манастыра ў Супраслі, зробленыя Ю. Ядкоўскім у 1913 годзе, а таксама змешчаны пераклад і арыгінал працы Ю. Ядкоўскага, прысвечанай манастыру[9]. Калекцыя гэтых негатываў на шкле знаходзіцца ў Інстытуце гісторыі мастацтва Польскай акадэміі навук у Варшаве.

Некаторыя здымкі з калекцыі негатываў паказаны на старонках манаграфіі літоўскай даследчыцы А. Нюнкаітэ *Lietuvos žydų tradicinio*

---

[1] Архіў ГДГАМ, справа № 3, арк. 206.

[2] Архіў ГДГАМ, справа № 3, арк. 18-19, 61-62

[3] Архіў ГДГАМ, справа № 3, арк. 71.

[4] Л. Коўкель, *З гісторыі кнігазбораў ГДГАМ,* "Краязнаўчыя запіскі" 1993, с. 23–24.

[5] І. Крайнева, *Дэкаратыўныя тканіны ў калекцыі арнатаў і далматык са збораў ГДГАМ,* "Краязнаўчыя запіскі" 2003.

[6] Т. Маліноўская, *Ю. Ядкоўскі – пачынальнік стварэння калекцыі народнага мастацтва ў Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі*, "Краязнаўчыя запіскі" 1990, с. 30–31.

[7] С. Палхоўская, *Калекцыя негатываў на шкле з фондаў ГДГАМ*, "Краязнаўчыя запіскі" 2000, вып. 5, с. 46–50.

[8] В. Лабачэўская, *Зберагаючы самабытнасць: з гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі,* Мінск 1998, с. 320–330.

[9] *Supraśl 1913: dokumentacja fotograficzna Józefa Jodkowskiego cerkwi Zwiastowania Najświętszej Marii Pannie,* red. P.J. Jamski, M. Zalewski, Warszawa 2016.

*meno ir simbolių pasaulis* (*Свет традыцыйнага мастацтва і сімвалаў літоўскіх габрэяў*)[1]. Сёння гэта ўнікальныя фатаграфіі, бо паказваюць незахаваныя драўляныя сінагогі. Арыгіналы фотаздымкаў захоўваюцца ў гродзенскім музеі.

Музейныя дакументы знаходзяцца ў розных архівах, сярод выяўленых варта згадаць, што частка дакументаў музея знаходзіцца ў Архіве даўніх актаў у Варшаве пад назвай *Zbiór Józefa Jodkowskiego* (nr zespołu 459). У першую чаргу гэта арыгіналы і копіі дакументаў з XVI–XX стст., фатаграфіі і замалёўкі, якія складалі частку большай калекцыі, страчанай падчас апошняй вайны. Дакументы былі набыты архівам у 2002 г.

У Архіве новых актаў знаходзіцца карэспандэнцыя музеяў міжваеннага часу з Міністэствам рэлігіі і асветы. Варта дадаць, што вялікая частка дакументаў міністэрства была страчана падчас Другой сусветнай вайны, таму мы маем толькі абмежаваную колькасць дакументаў. У першую чаргу гэта размеркаванне дзяржаўнага бюджэту па музеях, а таксама музейныя справаздачы і асабістыя справы некаторых супрацоўнікаў. Крыніцы па музейнай дзейнасці нешматлікія, працы Ю. Ядкоўскага прадстаўлены толькі ў форме справаздачы.

Музей у Гродне на чале з яго кусташам быў чальцом Саюза музеяў у Польшчы. Саюз пачаў дзейнічаць з 1914 г. Як паўнавартасная арганізацыя ён пачаў існаваць толькі з 1930 г. і з гэтага часу на сходах прысутнічалі прадстаўнікі не толькі дзяржаўных музеяў, а таксама і музеяў Польскага краязнаўчага таварыства і нацыянальных меншасцей з усёй Польшчы. Штогод праводзіліся сходы Саюза, на якім прысутнічалі і прадстаўнікі музеяў Заходняй Беларусі. Унутры Саюза дзейнічалі тры секцыі: рэгіянальных (адносіліся ўсе музеі ў Заходняй Беларусі, у тым ліку гродзенскі), украінскіх і гісторыка-мастацкіх музеяў. У 1939 г. у склад Саюза ўваходзіла 110 з 175 музеяў Польшчы[2]. Ю. Ядкоўскі сам прымаў удзел у большасці сходаў, выступаў на адным з іх, дзе абмяркоўваў праблемы рэгіянальных музеяў[3]. Дакументацыя Саюза музеяў знаходзіцца ў архіве Нацыянальнага музея ў Кракаве, частку яго дакументаў складае карэспандэнцыя Музея ў Гродне (Ю. Ядкоўскага).

Значэнне дзейнасці Ю. Ядкоўскага выяўляецца і ў яго прыватнай перапісцы з вядомымі навукоўцамі, у першую чаргу звязанымі з Вільняй і Універсітэтам Стафана Баторыя. Сярод лістоў атрымалася адшукаць карэспандэнцыю музейшчыка з наступнымі асобамі: бібліятэкарам універсітэцкай бібліятэкі ў Вільні Міхалам Бранштэйнам, супрацоўніцай Этнаграфічнага музея Універсітэта Стэфана Баторыя ў Вільні

---

[1] Aistė Niunkaitė Račiūnienė, *Lietuvos žydų tradicinio meno ir simbolių pasaulis*, Vilnius 2011, 695 s.

[2] A. Murawska, *Związek Muzeów w Polsce w latach 1914–1939*, „Muzealnictwo" 2015, nr 56, s. 115–125.

[3] J. Jodkowski, *O potrzebach muzealnictwa w województwach północno-wschodnich Rzeczypospolitej*, „Pamiętnik VI Zjazdu delegatów Związku Muzeów w Polsce odbytego w Krakowie w dniach 15/16 grudnia 1930 r.", Kraków 1931, s. 17–22.

Мар'яй Знамероўскай-Пруферовай, географам, прафесарам гэтага ж універсітэта Мечыславам Ліманоўскім.

Пошукі дакументаў і даследаванняў, звязаных з біяграфіяй Юзафа Ядкоўскага, павінны весціся не толькі ў Беларусі і Польшчы, бо частку свайго жыцця Ю. Ядкоўскі правёў у Маскве, дзе скончыў Маскоўскі археалагічны інстытут. Там захаваліся дакументы, звязаныя з навучаннем даследчыка. Беларускі нумізмат Віктар Какарэка выявіў новыя дакументы, звязаныя з гэтым перыядам яго біяграфіі, якія захоўваюцца ў Цэнтральным гістарычным архіве Масквы. Цікава, што ў адным з сваіх лістоў, які быў накіраваны да Санкт-Пецярбургскага дабрачыннага таварыства, Ю. Ядкоўскі напісаў пра сябе "Белорус, рождённый в Гродно, риммо-католического вероисповедания". Магчыма, гэтая ідэнтыфікацыя магла дапамагчы атрымаць сродкі на фінансаванне вучобы ў Маскве. В. Какарэка з'яўляецца таксама аўтарам сайта http://skarbonka.ru/num-ka/numizmaty/jodk/11-bibliografiya-iosifa-iodkovskogo, дзе змешчана бібліяграфія Ю. Ядкоўскага.

Асоба Ю. Ядкоўскага выклікае зацікаўленасць, і адкрыццё новых дакументаў ці новых лістоў даследчыка таксама адкрывае новыя бакі яго дзейнасці. Музей, створаны ў міжваенны час, і ў нашы дні з'яўляецца важнай часткай культуры горада. У сучасных даследаваннях пра Гродна спецыялісты розных гуманітарных дысцыплін актыўна выкарыстоўваюць як працы Ю. Ядкоўскага, так і назапашаныя ім калекцыі. З яго імем вельмі часта сустракаюцца даследчыкі ў архівах Польшчы і Беларусі, якія вывучаюць міжваенны перыяд культурнага і навуковага жыцця Гродзеншчыны.

Асоба Ю. Ядкоўскага часта згадваецца ў сучасным навукова-грамадскім жыцці Гродна. Важнай падзеяй з'яўляецца штогадовая прэмія імя Ю. Ядкоўскага, якая ўручаецца з 2012 года падчас святкавання Дзён Святога Губерта асобам, што даследуюць і папулярызуюць веды пра горад. Такім чынам, ён – як асоба мінулага – мае важнае значэнне для сучаснасці і нават будучыні горада над Нёманам.

*Tatsiana Kazak*

**From Past to Future: Significance of the Activity of Józef Jodkowski, the Researcher of Hrodna, in Modern Belarusian and Polish Science**

A b s t r a c t

The article is devoted to the famous Hrodna's historian – Józef Jodkowski (1890-1950), the founder and director of the Museum of Hrodna in the interwar period, when western Belarus was a part of Poland. Nowadays, the significance of his activity has a great influence on the scientific life in the city. Jodkowski's articles, books and correspondence are rich sources for the research on culture and science in the interwar Hrodna.